# ГРАМАДЗЯНСКАЕ ПРАВА ПА СТАТУЦЕ ВКЛ 1588 г.

***А. А. Міхневіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Грамадзянскае права XVI ст., якое з’яўлялася адной з вядучых галін права, рэгламентавала наступныя грамадскія адносіны: абавязацельственнае і рэчавае права, дагаварное, шлюбна-сямейнае, спадчыннае, апякунскае права і інш. На пачатку XVI ст. грамадзянскія праваадносіны ў ВКЛ былі ўжо дастаткова развітымі, аднак большая частка правоў належала толькі шляхце. З улікам незадаволенасці сялян абмежаваннем сваіх правоў у Статут ВКЛ 1588 г. былі ўключаны іх правы і абавязкі.

Адносна грамадзянскіх праваадносін у Статуце мы бачым рэгламентацыю ўсіх інстытутаў: грамадзянскага права, спадчыннага права (атрыманне спадчыны па завяшчанні), шлюбу, апякунства (раздз. 7, 8, 5, 6 адпаведна). Такі падзел на галіны, як нам здаецца, вельмі прагрэсіўны. На жаль, гэтыя веды былі страчаны ў перыяд залежнасці ад Расійскай імперыі і ў савецкія часы.

Асабліва патрэбна звярнуць увагу на сёмы раздзел, які складаўся з артыкулаў, прысвечаных рэчаваму, спадчыннаму і дагаварному праву. Спадчыннае права ў той час мела вялікую значнасць, бо з яго дапамогай шляхтай захоўваліся старыя ці набываліся новыя маёнткі. Калі ранней перадача маёнткаў у спадчыну другой асобе была абмежавана (Статут 1529 г. дазваляў перадаваць у спадчыну толькі 1/3 частку маёнткаў), то ўжо ў Статуце 1566 г. было замацавана права шляхты на поўнае распараджэнне сваімі маёнткамі. Гэта атрымала далейшае развіццё ў Статуце 1588 г., у якім рэгламентацыя распараджэння маёмасцю пастаўлена на першы план і ёй прысвечаны першы артыкул раздзела. У чацвёртым артыкуле быў замацаваны парадак абароны права, якое належала шляхце, што было прадугледжана першым артыкулам. Ахова ажыццяўлялася праз так званае «правіла мёртвай рукі» (маёмасць па завяшчанні пераходзіла ва ўласнасць толькі пасля смерці таго, хто зрабіў завяшчанне). Калі ж гэта правіла парушалася, перадача маёмасці трэцяй асобе лічылася незаконнай, а завяшчальны запіс несапраўдным. Гэтыя палажэнні дадаткова рэгламентаваліся артыкулам 6, дзе развіваліся

палажэнні чацвёртага артыкула, замацоўвалася «правіла мёртвай рукі другога парадку»: дазваленне перапісу завяшчання другой асобе ў тым выпадку, калі асоба, якой яно было прызначана, памерла раней за спадчынадаўца.

У Статуце даволі падрабязна рэгламентавалася арэнда, аднак дазвалялася арандаваць зямлю шляхте, вольным сялянам. Правы арандатараў былі адлюстраваны ў некаторых артыкулах (арт. 8, 22 і інш.). Так, шляхціцу забаранялася патрабаваць высялення арандатара ранней тэрміну, які быў указаны ў дагаворы. Калі ж дагавор парушаўся, уладар маёнтка павінен быў аплаціць штраф, як за гвалт. Патрэбна звярнуць увагу, што, калі прадаваўся маёнтак, той, хто яго купіў, набываў разам з ім і даўгі яго папярэдніка, калі ж новы ўладальнік паміраў, яго рухомая або нерухомая маёмасць апісвалася (арт. 10). Неабходна заўважыць, што гэта быў вельмі спрэчны артыкул, бо, з аднаго боку, па старажытным традыцыям любая маёмасць набывалася з усімі прыдаткамі, у тым ліку і з даўгамі, а з другога боку, на падставе прынцыпу справядлівасці лагічным было б наступнае: калі чалавек набываў маёнтак і не ведаў пра даўгі, то іх павінен быў аплаціць папярэдні ўладальнік. На невялікія рэчы (маёмасць, танней двухсот коп грошаў) маглі выдавацца княжацкія лісты.

Адносіны, звязаныя з купляй-продажам рухомых рэчаў, у тым ліку жывёлы, рэгламентаваліся арт. 28 раздз. 7. Так, застаўленне рухомай рэчы ў валоданні іншага чалавека на пэўны перыяд часу (сярэдневяковы ламбард быў добра развіты). Па гэтым артыкуле добра бачна, што залогавыя адносіны былі на вельмі высокім узроўні, што спрыяла развіццю гандлю і прыватнага «бізнесу».

Падагульняючы сказанае, можна зрабіць вывад, што асноўным інстытутам грамадзянскага права, безумоўна, было рэчавае права, асабліва права на нерухомасць, і для свайго часу вырашэнне маёнткавых спрэчак у ВКЛ было на вельмі высокім узроўні, таксама і альтэрнатыў набыцця зямлі было вельмі шмат.